С.А. Ніканенка (Мінск)

# АЛГАРЫТМ ЗНЯЦЦЯ АМАНІМІІ ЗАЙМЕННІКАВЫХ ФОРМ ДЛЯ АЎТАМАТЫЧНАЙ СІСТЭМЫ

Сёння, у час, калі вакол нас так шмат інфармацыі, што ўсё цяжэй бывае выдзеліць патрэбнае і важнае, неабходным становіцца выкарыстоўваць сістэмы аўтаматычнага рэферыравання тэксту (САР). Адным з этапаў САР з'яўляецца ацэнка інфарматыўнасці тэксту. Найбольш інфарматыўныя тыя словаформы і сказы, якія найчасцей скарыстоўваюцца ў тэксце (прынцып частотнасці). Пры гэтым праблемай з'яўляецца займеннік, які вельмі часта выкарыстоўваецца ў тэксце і не нясе ніякай інфармацыі, а толькі робіць спасылку на папярэдні адрэзак тэксту. Узнаўленне тэксту, якое не з'яўляецца

праблемай для носьбіта мовы, у аўтаматычных сістэмах праходзіць з цяжкасцю; больш таго, гэты працэс не заўсёды магчымы. Таму важна замяняць займеннікі паўназначнымі словамі. Пры адваротнай замене робіцца лексіка-граматычнае тэгіраванне тэксту. Пры гэтым аманімія займеннікавых форм выклікае цяжкасці.

Гэта тычыцца перш за ўсё асабовых займеннікаў 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку і аманімічных ім прыналежных, а таксама ўказальных займеннікаў *той (тая, тое, тыя), гэты (гэта(я), гэта(е), гэтыя)*. У родава-склонава-лікавай парадыгме гэтых займеннікаў заўважаем вялізную колькасць амонімаў.

Для пазбаўлення аманіміі аўтаматычнай сістэмай складаліся правілы як для аманімічных форм асабовых займеннікаў, прыналежных займеннікаў, так і для аманіміі міжразрадавай. Такім чынам, для асабовых займеннікаў на сённяшні дзень неабходна ўлічваць наступнае. Кожны дзеяслоў мае свае асаблівасці кіравання, якія выражаюцца ў семантыка-сінтаксічных адносінах дзеяслоўных словазлучэнняў, і патрабуе пэўнага склону для залежнага слова, у якасці якога можа выступаць і займеннік. Пры аналізе тэксту аўтаматычная сістэма, зыходзячы з даных машыннага слоўніка дзеяслоўнага кіравання, вызначае склон займенніка, які знаходзіцца пры дзеяслове.

*Дзеці абавязаны клапаціцца пра бацькоў, а таксама пра асоб, якія іх замяняюць, і аказваць ім дапамогу* [Канстытуцыя РБ 1994г]. Дзеяслоў *замяняць* вызначаецца тым, што можа кіраваць вінавальным і творным склонамі: *замяняць (каго? што?) дэталь, кіраўніка (кім?чым?) словам.* Займеннік *іх* мае аманімічныя формы роднага, вінавальнага, меснага склонаў займенніка *яны*. Пры аналізе адкідваюцца формы роднага і меснага склонаў, бо дзеяслоў патрабуе выключна вінавальнага склону пасля сябе.

З другога боку, такая часціна мовы, як прыназоўнік, мае ў мове некаторыя асаблівасці спалучальнасці. Як правіла, кожны прыназоўнік у беларускай мове «замацаваны» за адным склонам, аднак існуе пэўная колькасць прыназоўнікаў, якія могуць патрабаваць пасля сябе формы розных склонаў.

Пры аўтаматычным аналізе на падставе даных машыннага слоўніка спалучальнасці прыназоўнікаў вызначаецца склон займенніка, які знаходзіцца ў постпазіцыі прыназоўніка, ці адмаўляюцца некаторыя склоны. *...акты аб тлумачэнні Канстытуцыі лічацца прынятымі, калі за іх прагаласавала не менш як дзве трэці ад выбраных...* [Канстытуцыя РБ 1994г].

Пры аналізе з трох аманімічных форм займенніка *іх* выбіраецца форма вінавальнага склону, бо прыназоўнік *за* патрабуе пасля сябе слова ў форме вінавальнага ці творнага склонаў.

Прыналежныя займеннікі. Алгарытм вызначэння патрэбнай граматычнай займеннікавай формы для аўтаматычнай сістэмы заснаваны на асаблівасці прыналежных займеннікаў выконваць атрыбутыўную функцыю. Атрыбут, знаходзячыся пры назоўніку ці субстантыве, вызначаецца ім і прымае тыя ж граматычныя характарыстыкі. Таму прыналежны займеннік

які знаходзіцца ў прэпазіцыі (радзей – у постпазіцыі) назоўніка ці субстантыва, прымае тыя ж граматычныя характарыстыкі, што і азначаемае ім слова. Гэтым самым поўнасцю здымаецца аманімія прыналежных займеннікаў.

Аманімія паміж асабовымі і прыналежнымі займеннікамі. Для размежавання па разрадах трэба ўлічваць валентнасныя здольнасці асабовых і прыналежных займеннікаў. Канкрэтныя назоўнікі могуць мець пры сабе атрыбутыўныя азначэнні, але не могуць уступаць у аб'ектныя і суб'ектныя семантыка-сінтаксічныя адносіны, у якіх яны з'яўляюцца галоўным словам, таму могуць спалучацца толькі з займеннікамі прыналежнымі, але не асабовымі: *яе гітара, яго кніга, іх вуліца.* Спецыфіка значэння абстрактных назоўнікаў вызначае іх аб'ектныя і суб'ектныя семантыка-сінтаксічныя адносіны. Абстрактныя назоўнікі найчасцей маюць у сабе агульную семантыку дзеяння, працэсу, псіхічнага стану. Пры гэтым дзеянне заўсёды мае суб'екта і накіравана на аб'ект: *запіс (чаго?) альбома вымушае часу (=запіс (чаго?) яго вымушае часу).* Абстрактныя назоўнікі са значэннем працэсу маюць аб'ектны ці суб'ектны характар семантыка-сінтаксічных адносін і далучаюць асабовыя займеннікі. Назоўнікі, якія маюць значэнне выніку гэтага працэсу, дзеяння, вымушаюць далучэння атрыбута (прыналежнага займенніка).

Трэба адзначыць, што ў гэтай сітуацыі варта было б размяжоўваць менавіта семантыку назоўнікаў – абстрактную ці канкрэтную, бо, як бачым, размеркаванне па гістарычна складзеных разрадах не можа ўлічыць спецыфікі такога аналізу. Назоўнікі з канкрэтнай семантыкай, якія адносяцца да разраду абстрактных, маюць спецыфічнае семантычнае «адценне канкрэтнасці». У гэтым выпадку паняцці *рашэнне, адкрыццё, завяршэнне, аналіз і інш.* можна ўявіць у выглядзе статычнай з'явы, выніка, занатаванага дзе-небудзь.

Указальныя займеннікі. Для нас важным з'яўляецца разгаліноўваць выпадкі, калі ўказальныя займеннікі выконваюць атрыбутыўную функцыю ці характарызуюцца іншымі лексіка-сінтаксічнымі адносінамі. Гэта даволі просты і адназначны алгарытм, які можа выкарыстоўваць аўтаматычная сістэма. Калі ўказальны займеннік знаходзіцца ў прэпазіцыі (рэдка – постпазіцыі) назоўніка ці субстантыва, то ён характарызуецца як атрыбут. У гэтым выпадку замена яго паўназначным словам непатрэбная: *Гэты факт.* У адваротным выпадку ўказальны займеннік вымушае выкарыстоўваць алгарытм адваротнай замены яго паўназначным словам: *І тыя і другія не прызнавалі права беларусаў на дзяржаўную незалежнасць і нацыянальную самастойнасць* [Тычына М. 2000].

Дзеля высвятлення ўмоў адваротнай замены быў зроблены статыстычны аналіз двух тэкстаў – навукова-папулярнага (літаратурнага) артыкула Міхася Тычыны «Цана прароцтваў (Кузьма Чорны)» і Канстытуцыі РБ 1994г., якая з'яўляецца дакументам афіцыйна-дзелавога (канцэлярскага) стылю.

Вынікі лексіка-статыстычнага аналізу наступныя: усяго на старонках артыкула М. Тычыны выкарыстана 184 займеннікі. У 68 выпадках (91 без

пазбаўлення аманіміі) (≈37%; ≈49%) адназначная замена немагчымая. Адна у 34 (26) выпадках (≈18%; ≈14%) магчымая адназначная замена: у 15 (10) выпадках – замена ў той жа форме; у 19 (16) выпадках – пры замене склону. Трэба адзначыць, што ў 23 (22) выпадках (≈12%) магчымая замена займеннікаў апошнім словам і ў 24 (16) выпадках (≈13%; ≈9%) – словам у тым жа склоне.

Вынікі аналізу Канстытуцыі РБ прыкладна такія ж: дзевятнаццаць старонак тэксту змяшчаюць 100 займеннікаў, выкарыстаных у анафарычнай функцыі. У 37% (71%) выпадкаў адназначная замена немагчымая. У 23% (17%) магчымая адназначная замена: у 4 (0) выпадках – замена ў той жа граматычнай форме; у 19 (17) выпадках – пры замене склону. У 21% (3%) выпадкаў магчымая замена словам у тым жа склоне.

Такім чынам, відавочна павышэнне працэнту магчымасці замены пасля пазбаўлення аманіміі.